СТЫХІ ПРАФЕСАРА БОНДАРАВАЙ
З дня нараджэння заснавальніцы беларускай школы кінакрытыкі споўнілася 100 гадоў
Стар. 2

УХІЛ НА ПРАКТЫЧНЫ ДОСВЕД
Паглядзелі, як у БДУ навучаюць мытнай справе і крыміналістыцы
Стар. 4–5

КРОК СА СВЯТЛА Ў ЦЕМРУ
Інтэрв'ю з дацэнтам кафедры генетыкі Васілём Грынёвым, які вывучае лейкозныя клеткі крыві
Стар. 6

ФОРУМ ЛІДАРСТВА
Тэмы і праблемы шостага Міжнароднага моладзевага форуму «М.І.Р.»
Стар. 7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»

22 лістапада 2022 года, № 12 (2263)

БДУ наладжвае супрацоўніцтва з Іарданіяй

Інтэрнацыялізацыя і развіццё экспартнага патэнцыялу – у ліку прыярытэтных задач універсітэта. З 14 па 18 лістапада дэлегацыя БДУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём наведала з афіцыйным візітам Іарданскае Хашыміцкае Каралеўства.

Падчас наведвання Іарданскага ўніверсітэта (вядучай і найстарэйшай ВНУ Іарданіі) дэлегацыі абмеркавалі магчымыя супольныя адукацыйныя праграмы ў галіне турызму, міжнародных адносін, права і эканомікі, падрыхтоўку выкладчыкаў арабскай мовы, а таксама гасцявыя лекцыі іарданскіх спецыялістаў у галіне выкладання арабскай мовы і культуры, стажыроўкі для выкладчыкаў і студэнтаў-арабістаў БДУ. Падчас візіту ў Іарданію адбыліся таксама перамовы з кіраўніцтвам шэрагу іншых універсітэтаў. Дарэчы, Універсітэт прыкладных навук Аль-Балкі зацікаўлены ў супольных даследаваннях у сферы ІТ і кантрактнай распрацоўцы электронікі, а Тэхналагічны ўніверсітэт імя прынцэсы Сумаі – у рэалізацыі супольных праектаў дадатковай адукацыі дарослых.

На ўсіх пляцоўках іарданскіх ВНУ ў час візіту беларускай дэлегацыі працавала тэматычная экспазіцыя «Дні адчыненых дзвярэй БДУ», на якой былі прадстаўлены адукацыйная і навуковая дзейнасць універсітэта, інфармацыя пра спецыяльнасці і перспектывы навучання ў ім.

Важным для развіцця адукацыйных і культурных сувязяў дзвюх краін стала наведванне дэлегацыяй БДУ Нацыянальнай бібліятэкі Іарданіі (НБІ). Вынікам сустрэчы стала дамоўленасць пра падпісанне хуткім часам Мемарандума аб паразуменні паміж БДУ і НБІ. Гэты дакумент узмоцніць аўтарытэт навуковых выданняў дзвюх краін.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

100+1: новае стагоддзе ў гісторыі БДУ

Напрыканцы кастрычніка БДУ штогод святкуе дзень заснавання. Яшчэ не забыліся пышныя святочныя імпрэзы да стогадовага юбілею, але неўзабаве праляцеў год – пачалося новае стагоддзе ў гісторыі ўніверсітэта.

Да святкавання 101-годдзя ў БДУ прайшоў шэраг мерапрыемстваў на факультэцкім і ўніверсітэцкім узроўнях. Святочная праграма ўключала навуковыя канферэнцыі, форумы, інтэлектуальныя спаборніцтвы, конкурсы, выставы і канцэрты. Абсалютна ўсе традыцыйныя акцыі ў кастрычніку прайшлі пад эгідай Дня нараджэння ўніверсітэта.

Урачыстай падзеяй стаў Савет БДУ. У віншавальнай прамове з нагоды 101-годдзя рэктар БДУ **Андрэй Кароль** адзначыў, што сакрэт жыццяздольнасці ўніверсітэта ў любыя гістарычныя часы крыецца ў спалучэнні векавых традыцый, досведу з інавацыямі і зменамі. «І сёння ў свеце мы назіраем вельмі няпросты, эвалюцыйны, цывілізацыйны этап, калі хуткасці адмаўляюць сэнсы і прыводзяць да распаду вельмі многіх каштоўнасцяў, робячы наш свет аднастайным і шаблонным. Пры гэтым Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт насуперак гэтай аднастайнасці не страчвае сваёй унікальнасці. І каштоўнасць заключаецца ў карпаратыўнасці і традыцыях, калі ўніверсітэт выглядае як адзіная сям'я. Вельмі радуе, што многія з нас не мысляць сябе па-за ўніверсітэтам, студэнты хочуць застацца тут і звязаць сваю кар'еру з развіццём БДУ. Гэта стаўленне да ўніверсітэта як да каштоўнасці, якая значна больш старажытная і моцная, чым тысячы гадоў розных канфліктаў». Андрэй Кароль падзякаваў калектыву за плённасць у працы і неабыякавасць да ВНУ і пажадаў кожнаму новых адкрыццяў і здзяйсненняў, здароўя, поспехаў, шчасця ў коле сваіх блізкіх і родных.

Віншаванні ў адрас універсітэта накіравалі старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі **Васіль Герасімаў**, старшыня Вярхоўнага Суда **Валянцін Сукала**, старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук (НАН) Беларусі **Уладзімір Гусакоў**, старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі (ВАК) Беларусі **Аляксандр Гучок**.

Дарэчы, Валянцін Сукала сваё прафесійнае даўгалецце звязвае з якасцю адукацыі, якую ён атрымаў на юрыдычным факультэце БДУ.

Уладзімір Гусакоў адзначыў, што БДУ і НАН маюць гістарычную агульнасць, бо ля вытокаў заснавання дзвюх устаноў стаялі адны і тыя ж знакамітыя дзеячы. Ён высока ацаніў навуковы і адукацыйны патэнцыял БДУ, пажадаў супрацоўнікам і студэнтам поспехаў, дасягненняў і рэалізацыі задуманага.

Падчас святочнага пасяджэння адбылася цырымонія ўручэння супрацоўнікам БДУ ведамасных узнагарод. Акрамя таго, за значны ўнёсак у развіццё навуковых даследаванняў, падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі ганаровай граматай НАН Беларусі ўзнагароджаны і сам БДУ.

За плённую навуковую дзейнасць і актыўнае ўзаемадзеянне з НАН Беларусі памятны знак «У гонар 100-годдзя Інстытута беларускай культуры» ўручылі прафесару кафедры функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі механіка-матэматычнага факультэта Анатолю Антаневічу, прафесару кафедры глебазнаўства і геаінфармацыйных сістэм факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі Мікалаю Клебановічу, прафесару кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Ганне Кулеш.

Пасведчаннямі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў узнагароджаны другакурснік хімічнага факультэта БДУ Кірыл Мароз, магістранты юрыдычнага факультэта Іван Аземша і Генадзь Мясаедаў, аспірант біялагічнага факультэта Соф'я Лявыкіна. Таксама пасведчанні ўручылі першаму прарэктару Дзмітрыю Курловічу і прафесару кафедры міжнародных адносін ФМА Святлане Свілас.

За шматгадовую добрасумленную працу і вялікі асабісты ўнёсак у развіццё ўніверсітэта 25 супрацоўнікаў ганараваны звання «Заслужаны работнік БДУ». Таксама ў святочнай зале пасяджэння ўшаноўвалі супрацоўнікаў, ганараваных падзякі рэктара БДУ. За асабісты ўнёсак ва ўмацаванне партнёрскіх адносін, развіццё супрацоўніцтва з ВНУ 7 прадстаўнікоў розных міністэрстваў і ведамстваў адзначаны спецыяльным нагрудным знакам «100 гадоў БДУ».

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УНІВЕРСІТЭТ
22 лістапада 2022 года, № 12 (2263)

Стыхіі прафесара Бондаравай

Замежныя калегі жартаўліва называлі яе «партызанскай Фросяй», беларускія сябры далі імя «матрыярх айчыннай кінакрытыкі». Вучні-рэжысёры Віктар Дашук і Анатоль Алай лічылі яе сваёй хроснай маці і анёлам-ахоўнікам. У дзяцінстве яна марыла пра неба, і стала адной з першых па велічыні зорак беларускага кіназнаўства. Усё гэта – пра прафесара Еўфрасінню Леанідаўну Бондараву, з дня нараджэння якой 25 лістапада спаўняецца 100 гадоў.

Еўфрасіння Бондарава нарадзілася ў вёсцы Гапонава Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. У вялікай вясковай сям'і яна была пятым дзіцём і самай малодшай з сясцёр. Бацькоўскія ўрокі былі простымі, нешматслоўнымі, але вельмі канцэнтраванымі. Іх дзяўчына памятала ўсё жыццё.

«Мае бацькі былі звычайнымі сялянамі, і іх урокі ў асноўным працоўныя: пра стаўленне да зямлі, да жыцця... Яны ніколі не гаварылі мне слоў пра сумленнасць, чалавечую годнасць. Казалі: не лянуйся, працуй, дапамагай іншым. А яшчэ – не вазьмі чужога – зарабі сваё», – узгадвала Еўфрасіння Леанідаўна ў гутарцы з Таццянай Падаляк для газеты «Універсітэт» (№ 15 ад 22 верасня 2011 года).

У дзіцячыя гады дзяўчынка, убачыўшы ў часопісе авіяцыйную форму непаўторнай прыгажосці, марыла стаць лётчыцай. Пазней задумалася пра геолагаразведачны інстытут: так хацелася вандраваць! Але пасля заканчэння дзесяцігодкі яе паклікаў да сябе ў Ленінград, дзе вучыўся ў Інстытуце кінаінжынераў, старэйшы брат Якаў. Як выдатніца, Фруза без экзаменаў была залічана на гістарычны факультэт Ленінградскага ўніверсітэта. Выбар схіліўся ў гэты бок яшчэ і таму, што толькі на гістфаку тады давалі інтэрнат.

«Толькі мяне вельмі цягнула на філфак. У Ленінградзе я даведалася, што ў горадзе ёсць Інстытут журналістыкі імя Вароўскага, і захацела з наступнага – 1941-га – года там вучыцца. Планы перарвала вайна», – расказвала вучням Еўфрасіння Бондарава.

Навучанне на гістфаку таксама хутка давялося спыніць, каб зарабляць: сям'я жыла небагата. Еўфрасіння вярнулася дадому, дзе побач з працай піянерважатай для яе адкрывалася дарога ў журналістыку: падпрацоўкай хацелася дапамагчы не толькі бацькам, але і фінансава падтрымаць брата-студэнта. Так, пад словы дыктара радыёкропкі раённай газеты «Увага! Увага! Гаворыць лёзненскі радыёвузел. Перадаём апошнія паведамленні» – адбывалася ўваходжанне ў справу жыцця.

З пачаткам вайны дзяўчына моцна захварэла. Неўзабаве прыйшлі звесткі, што падчас блакады Ленінграда загінуў брат. Пазней яна прысвеціць яго памяці большасць сваіх дасягненняў, але тады патрэбна было выбудоўваць арыенціры будучыні без яго.

Пасля вызвалення Лёзненскага раёна Еўфрасінню паклікалі працаваць у раённую газету. Тут яна прайшла «баявое» хрышчэнне: тром чалавекам, якія ўручную выпускалі нумар, прыйшлося сумяшчаць некалькі пасад – карэспандэнта, рэдактара, наборшчыка. А пасля працы бегла на заняткі самадзейнасці, якой яна тады кіравала.

У 1945 годзе Еўфрасіння Бондарава паступіла на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, разам з невялікай групай аднагодкаў увайшоўшы ў першы набор беларускіх журналістаў. І з першых курсаў журналісцкая практыка аднавілася: дзяўчына ўвесь час працавала ў рэспубліканскім друку, крыху пазней – у аддзеле навін на радыё. Тады ж з'явіўся яе каронны студэнцкі прынцып: «На „чацвёрку" – ведаю, на „пяцёрку" – як пашанцуе, а на „тройку" – не здамся».

Праз некалькіх дзесяцігоддзяў у інтэрв'ю Еўфрасіння Леанідаўна раскажа, што яе жыццё – гэта «дзве стыхіі – журналістыка і кіно, якія ідуць побач і дапаўняюць адна адну». А студэнцтва – менавіта той час, калі яна як журналіст выбрала для сябе напрамак, пра які марыў брат, – кіно. Канчатковаму вызначэнню паспрыяў выпадак – сустрэча з пісьменнікам і сцэнарыстам Міхаілам Блісцінавым: ён запрасіў Еўфрасінню на пасаду рэдактара-кансультанта ў Міністэрства кінематаграфіі пры Саўміне БССР.

«Спачатку здзівілася: які з мяне кінакансультант? А потым згадзілася, бо зразумела, што пасада будзе цікавай, дасць магчымасць творча расці, – узгадвала прафесар Бондарава ў інтэрв'ю часопісу „Мастацтва" (№10 за 1997 год). – Давялося самастойна скончыць кінаінстытут – перачытала шмат сцэнарыяў, літаратуры па кіно, прагледзела шмат фільмаў, брала камандзіроўкі ў Маскву і Ленінград, у фільмасховішчах вывучала вытворчы працэс – ад запуску кіно да прэм'еры. І ўжо калі Міністэрства кінематаграфіі пераўтварылі ў частку Міністэрства культуры, мяне прызначылі галоўным рэдактарам па вытворчасці фільмаў».

Пасля заканчэння ўніверсітэта дзяўчына паступіла ў аспірантуру, пачала займацца даследчыцкай дзейнасцю. У 1953 годзе малады спецыяліст абараніла кандыдацкую дысертацыю, і яе запрасілі выкладаць гісторыю беларускага кіно на факультэце журналістыкі. Так паступова нарадзіліся спецкурсы «Нарыс і фельетон у друку» і «Літаратурна-мастацкая крытыка», пабачылі свет вучэбныя дапаможнікі і кнігі па кінакрытыцы, з'явілася нямала артыкулаў, рэцэнзій і творчых партрэтаў сучаснікаў.

З цягам часу размовы пра кіно перасяліліся і дадому да Еўфрасінні Бондаравай – яна выйшла замуж за аператара Алега Аўдзеева, з якім яны пазнаёміліся на «Беларусьфільме». Ды і сярод сяброў было нямала людзей, звязаных з галіной.

Пра кіно яна не пераставала пісаць ніколі. Блізкія Еўфрасінні Леанідаўны гавораць, што яна не дзяліла выданні на «вялікія» і «малыя»: з аднолькавай аддачай яна пісала ў раёнкі і шматтыражкі, абласныя і рэспубліканскія газеты, у «тонкія» масавыя і «тоўстыя» спецыялізаваныя часопісы. Гэтак жа яна ставілася і да людзей.

Неад'емнай часткай жыцця галоўнага кінакрытыка Беларусі заўсёды была педагагічная дзейнасць. Прафесар Бондарава была «неспакойным» выкладчыкам: курыравала студэнцкія выданні журфака, кіравала навуковымі работамі, выпускала альманах літаратурна-мастацкай творчасці, ладзіла творчыя сустрэчы і кінавечары. І галоўнай педагагічнай якасцю Еўфрасінні Леанідаўны, як успамінаюць яе студэнты, было жаданне «заразіць» студэнтаў любоўю да кіно, журналістыкі і творчасці ў цэлым. Моладзь нават жартавала: «Бондарава нам усім зрабіла прышчэпку да кіно». А яшчэ прафесар не магла не падтрымліваць старанных пачаткоўцаў, калі тыя рабілі першыя крокі ў мастацтва, навуку ці журналістыку.

Еўфрасіння Леанідаўна гаварыла, што ёй як педагогу і крытыку цікава адшукваць у студэнтах іскрынкі таленту і распальваць іх. Невыпадкова ў педагагічным «актыве» Бондаравай нямала вядомых вучняў. Сярод іх – крытыкі Людміла Саянкова-Мяльніцкая, Ніна Фральцова, Людміла Перагудава, кінарэжысёры Анатоль Алай, Ігар Дабралюбаў, Віктар Дашук, прафесар Таццяна Падаляк і інш. «Тачылі» стыль пад яе наглядам у рукапісным альманаху «Творчасць журналіста» і некаторыя пісьменнікі – Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Іван Пташнікаў і Іван Чыгрынаў.

Калегі педагога ўзгадваюць, што на факультэце яна заўсёды была занятай: то чытала, то выступала апанентам, то пісала водгукі на аўтарэфераты дысертацый. На ўшчуванні наконт бяссонных праз працу начэй яна жартавала, называючы сябе «чалавекам з незгінальнай спінай» ці апраўдвалася кароткім: «Мне сёння запісалася». А яшчэ Еўфрасіння Леанідаўна была добрым арганізатарам і суразмоўцам: на сустрэчы са студэнтамі, якія ладзіла выкладчыца, у розныя часы завітвалі Алесь Адамовіч, Васіль Быкаў, Вольга Іпатава, Янка Брыль, рэжысёры Ларыса Шапіцька, Вадзім Абдрашытаў, кінакрытыкі Георгій Капралаў і Расціслаў Юрэнеў.

У асяроддзі калег і студэнтаў прафесара Бондаравай за ёй назаўсёды замацаваўся вобраз патрабавальнага, прамалінейнага і ў той жа час добрага і схільнага да спачування чалавека з незвычайным пачуццём гумару. Яна ўмела слухаць іншых і шмат вучылася ў тых, хто быў побач, адначасова па ўсіх пытаннях маючы ўласную пазіцыю. Магла «рубануць» праўду ў вочы, не баялася быць рэзкай і заўсёды насіла студэнтам абаранкі. Яе не баяліся, але мала хто меў духу з ёй спрачацца: у кутках яе вачэй жыў свет, які мог расфарбоўваць усмешку прафесара ў добрую ці злёгку хітраватую. У многіх выпускнікоў педагога журфак і сёння асацыіруецца з ёй – Бондаравай, якая расказвае пра кіно.

Ірына ІВАШКА

ДАВЕДКА

Еўфрасіння Леанідаўна Бондарава (1922–2011) – прафесар, доктар філалагічных навук, заслужаны дзеяч навукі БССР, кінакрытык, журналіст, педагог, заснавальнік беларускай школы кінакрытыкі.

Аўтар кніг «У кадры і за кадрам» (1969), «Час, экран, крытыка» (1975), «Экран у розных вымярэннях» (1983), «Кінематограф і літаратура: творы беларускіх пісьменнікаў на экране», «Ад сэрца – да сэрца» (2001) і інш.

Прызначэнні

ПЕРШЫМ ПРАРЭКТАРАМ БДУ ПРЫЗНАЧАНЫ КАНДЫДАТ ГЕАГРАФІЧНЫХ НАВУК ДЗМІТРЫЙ КУРЛОВІЧ.

28 кастрычніка падчас Урачыстага пасяджэння Савета БДУ яго прадставіў працоўнаму калектыву рэктар Андрэй Кароль. Звяртаючыся да першага прарэктара, кіраўнік ВНУ выказаў упэўненасць, што яго багаты прафесійны досвед, веды і кампетэнцыі паспрыяюць умацаванню і развіццю ўніверсітэта.

Калектыў універсітэта віншуе Дзмітрыя Міраслававіча з прызначэннем на новую пасаду і жадае рэалізацыі вызначаных планаў на карысць і развіццё ўніверсітэта.

Даведка:

Курловіч Дзмітрый Міраслававіч – дацэнт, кандыдат геаграфічных навук. Нарадзіўся ў 1980 годзе ў г. Валожын (Мінская вобласць). У 2003 годзе з адзнакай скончыў геаграфічны факультэт і паступіў у аспірантуру БДУ на кафедру дынамічнай геалогіі. У гады вучобы ў аспірантуры быў запрошаны на стажыроўку на геалагічны факультэт Лундскага ўніверсітэта (Швецыя), навучаўся ў галіне геамарфалогіі і чацвярцічнай геалогіі, паспяхова абараніў магістарскую дысертацыю на тэму «The Polotsk-Kurzeme and the Smaland-Blekinge Deformation Zones of the East European Craton: geomorphology, architecture of the sedimentary cover and the crystalline basement».

У 2011 годзе ў БДУ абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Прасторавая дыферэнцыяцыя і дынаміка морфаструктур Беларускага Паазер'я».

З 2007 па 2017 год працаваў на кафедры глебазнаўства і геалогіі, дзе прайшоў шлях ад асістэнта да дацэнта. З 2017 па студзень 2019 года ўзначальваў кафедру глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм. З 2019 года па дадзены момант працаваў на пасадзе дэкана факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ.

Галіна навуковых інтарэсаў уключае геаграфічныя інфармацыйныя сістэмы, фізічную геаграфію, геамарфалогію, геалогію.

Узнагароджаны граматай (2012) і ганаровай граматай (2015) БДУ, падзякай рэктара БДУ (2020), Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2021), Ганаровай граматай Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь (2018), Ганаровай граматай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь (2019), Ганаровай граматай Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз (2021), Ганаровай граматай Федэральнага агенцтва па нетракарыстанні Расійскай Федэрацыі (2021). У 2014 г. ганараваны стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь як таленавіты малады навуковец. У 2017 г. адзначаны другой прэміяй спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў за адмысловы ўнёсак у развіццё здольнасцяў адораных навучэнцаў і студэнтаў, у 2022 г. – першай прэміяй.

Аўтар больш як 140 навуковых і навучальна-метадычных прац, у тым ліку 4 манаграфій і 10 навучальна-метадычных дапаможнікаў.

ПРАРЭКТАРАМ ПА ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОЦЕ І САЦЫЯЛЬНЫХ ПЫТАННЯХ ПРЫЗНАЧАНА КАНДЫДАТ ЮРЫДЫЧНЫХ НАВУК ГАННА БАКУН.

Адпаведны загад падпісаў рэктар БДУ Андрэй Кароль.

Калектыў універсітэта віншуе Ганну Станіславаўну з прызначэннем на новую пасаду і жадае прафесійных дасягненняў, натхнення і сіл для рэалізацыі новых планаў.

Даведка:

Бакун Ганна Станіславаўна нарадзілася ў 1985 годзе ў г. Свіслач (Гродзенская вобласць). Скончыла з адзнакай Інстытут дзяржаўнага кіравання Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь у 2007 годзе, у 2008 годзе – магістратуру, у 2011 годзе – аспірантуру дадзенай ВНУ. Таксама ў 2010 годзе скончыла Інстытут журналістыкі БДУ. Працоўную дзейнасць у БДУ пачала з 2013 года на юрыдычным факультэце, дзе з 2020 года па цяперашні час працавала намеснікам дэкана па навучальна-выхаваўчай рабоце.

У 2017 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю «Канстытуцыйна-прававое рэгуляванне забеспячэння рэалізацыі свабоды веравызнання рэлігійнымі арганізацыямі ў Рэспубліцы Беларусь» і атрымала навуковую ступень кандыдата юрыдычных навук. У 2018 годзе прысвоена навуковае званне дацэнта па спецыяльнасці «права».

Выканавец навукова-даследчых прац «Асноўныя напрамкі фармальна-лагічнага і лінгвістычнага ўдасканалення заканадаўства Рэспублікі Беларусь», «Забеспячэнне бяспекі індывіда ў міжнародным праве», «Акты міжнародных арганізацый і іх рэалізацыя ў нацыянальным заканадаўстве».

Прайшла навучанне па павышэнні кваліфікацыі ва ўстановах адукацыі Беларусі, Расіі, Германіі, Венгрыі і Нідэрландаў.

Аўтар звыш 60 артыкулаў і тэзісаў дакладаў у навуковых часопісах і зборніках прац і матэрыялаў канферэнцый, шасці метадычных і навучальных выданняў.

ДЭКАНАМ ФАКУЛЬТЭТА ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ ПРЫЗНАЧАНЫ КАНДЫДАТ ФІЗІКА-МАТЭМАТЫЧНЫХ НАВУК ЮРЫЙ АРЛОВІЧ.

Афіцыйнае прадстаўленне калектыву адбылося 4 лістапада падчас пашыранага пасяджэння савета факультэта.

З падзякай за паспяховае развіццё факультэта да дэкана 2020–2022 гадоў Аляксандра Недзьведзя звярнуўся рэктар БДУ Андрэй Кароль. За яго асабісты ўнёсак, неабыякавае стаўленне да ВНУ і факультэта яму быў уручаны падзячны ліст рэктара. Кіраўнік ВНУ пажадаў далейшых поспехаў у прафесійнай дзейнасці і рэалізацыі мэт, вызначаных у галіне навукі. Аляксандр Недзьведзь будзе працаваць на пасадзе прафесара на факультэце.

Калектыў універсітэта віншуе Юрыя Леанідавіча і жадае плённай працы на пасадзе кіраўніка ФПМІ.

Даведка:

Арловіч Юрый Леанідавіч нарадзіўся ў 1971 годзе ў в. Краснае Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. У 1993 годзе скончыў механіка-матэматычны факультэт БДУ, а ў 1996 годзе – аспірантуру дадзенага факультэта. З 1997 года па 2006 год працаваў у Інстытуце матэматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў аддзеле камбінаторных мадэляў і алгарытмаў. У 2021 годзе скончыў дактарантуру БДУ. У 2004 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю «Аналіз будовы і апісанне графаў з абмежаванай лакальнай структурай».

З 2006 па 2018 год працаваў на кафедры дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (ФПМІ) на пасадзе дацэнта. У 2011 годзе прысвоена навуковае званне дацэнта па спецыяльнасці «матэматыка».

З верасня 2018 года па цяперашні час працаваў на пасадзе загадчыка кафедры біямедыцынскай інфарматыкі ФПМІ.

Асноўныя навуковыя дасягненні звязаны з даследаваннем структурных уласцівасцяў графаў з зададзенай лакальнай будовай, ацэнкай вылічальнай складанасці і складанасці апраксімацыі ключавых задач камбінаторнай аптымізацыі і алгарытмічнай тэорыі графаў.

Браў удзел у выкананні 15 навуковых праектаў, сярод якіх 11 праектаў БРФФД і 4 міжнародных праектаў INTAS. Выступаў з навуковымі дакладамі на міжнародных канферэнцыях і ў вядучых замежных навуковых цэнтрах у Расіі, Аўстрыі, Германіі, ЗША, Францыі, Швейцарыі. З'яўляўся членам праграмных камітэтаў шэрагу прадстаўнічых міжнародных навуковых канферэнцый па дыскрэтнай матэматыцы і біяінфарматыцы. Кіраўнік НДР «Даследаванне камбінаторна-графавых аб'ектаў: аптымізацыя, прадстаўленне, структурныя і складанасныя аспекты» ДПНД «Канвергенцыя–2025».

Аўтар звыш 100 навуковых прац у галіне тэорыі графаў і камбінаторнай аптымізацыі. Падрыхтаваў двух кандыдатаў навук.

Узнагароджаны падзячным лістом БДУ (2013 г.), граматай БДУ (2016 г.), ганаровай граматай Беларускага дзяржаўнага фонду фундаментальных даследаванняў (2015 г.), ганаровай граматай БДУ (2021 г.).

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

06 снежня Песнякевіч Аляксандр Георгіевіч, дацэнт кафедры мікрабіялогіі

07 снежня Фралова Наталля Юр'еўна, дацэнт кафедры камунікатыўнага дызайну

27 снежня Далгарукаў Сяргей Валер'евіч, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду

27 снежня Мядзведзь Ірына Мікалаеўна, дацэнт кафедры агульнай фізікі

29 снежня Пратасавіцкі Сяргей Пятровіч, дацэнт кафедры грамадзянскага права

АБ'ЯВЫ

НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ВЯДУЧАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА навукова-даследчай лабараторыі праблем бяспекі інфармацыйных тэхналогій;

ГАЛОЎНАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА навукова-даследчай лабараторыі матэматычных метадаў абароны інфармацыі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, п. 802, НДІ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі, тэл. 209-51-04.

***

ВЫНІКІ КОНКУРСУ НА СУІСКАННЕ ПРЭМІІ ІМЯ У. І. ПІЧЭТЫ Ў НАМІНАЦЫІ «АДУКАЦЫЯ» ЗА 2022 ГОД

Праца «Навукова-метадычны комплекс па эканаметрыцы і інавацыях у эканоміцы».

Аўтар: Хацкевіч Генадзь Аляксеевіч, загадчык кафедры бізнес-адміністравання Інстытута бізнесу БДУ, доктар эканамічных навук, прафесар.

Праца зацверджана Саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, пратакол № 02 ад 28 кастрычніка 2022 года.

ВЫНІКІ КОНКУРСУ НА СУІСКАННЕ ПРЭМІІ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ Ў НАМІНАЦЫІ «АДУКАЦЫЯ» ЗА 2022 ГОД

Праца «Навучальна-метадычны комплекс па фізічнай геаграфіі».

Аўтар: Кальмакова Алена Генадзьеўна, дацэнт кафедры фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій, намеснік дэкана па вучэбнай рабоце, кандыдат геаграфічных навук, дацэнт.

Праца зацверджана Саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, пратакол № 02 ад 28 кастрычніка 2022 года.

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

УЛАСНЫ АМФІТЭАТР АДКРЫТЫ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ БДУ

Новае архітэктурнае збудаванне ўпрыгожыць унутраны дворык і дапоўніць кампазіцыю абноўленай да 100-гадовага юбілею ВНУ інфраструктуры.

Урачыстае адкрыццё амфітэатра з удзелам рэктара БДУ Андрэя Караля, дэканаў, выкладчыкаў і студэнтаў адбылося 28 кастрычніка. Як распавёў падчас адкрыцця рэктар, гэта не тэатральная пляцоўка, а адкрытая прастора для сустрэч студэнтаў з кіраўніцтвам ВНУ. Тут у нефармальнай атмасферы студэнты змогуць задаваць пытанні і атрымліваць неабходную інфармацыю пра жыццё ўніверсітэта. У той жа час гэта тэрыторыя для розных мерапрыемстваў, якімі напоўнена ўніверсітэцкае жыццё. Ёсць умовы для правядзення лекцый, майстар-класаў, дыскусій і семінараў. Амфітэатр можа быць «залай» для танцавальных і музычных выступленняў, публічных акцый.

Будынак уяўляе сабой паўкруглую канструкцыю пад адкрытым небам з чатырма шэрагамі сядзенняў. Тут змогуць размясціцца 186 чалавек. Да канструкцыі падведзены інжынерныя камунікацыі: электрычная сетка, вонкавае асвятленне, выхад у інтэрнэт, ёсць таксама ўмовы для падлучэння мультымедыйнага абсталявання.

Месца размяшчэння амфітэатра невыпадковае. Унутраны дворык з'яўляецца візітнай карткай БДУ, увасабленнем і сімвалам яго гісторыі. Сёлета тэрыторыя дворыка зведала маштабнае абнаўленне.

УНІВЕРСІТЭТ
22 лістапада 2022 года, № 12 (2263)

Вышэйшая адукацыя з ухілам

Большасць абітурыентаў і студэнтаў БДУ разлічваюць атрымаць падчас вучобы тут неабходныя для старту ў прафесіі кампетэнцыі і навыкі. Універсітэт паступова стварае ўмовы для практыка-арыентаванага навучання, напрыклад, спецыялізаваныя кабінеты і лабараторыі для заняткаў. У лістападзе карэспандэнты газеты завіталі на заняткі студэнтаў кафедры мытнай справы факультэта міжнародных адносін і кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта.

Мытная справа – іх справа

Ва ўладаннях кафедры мытнай справы факультэта міжнародных адносін БДУ знаходзяцца спецыялізаваныя кабінеты, дзе студэнты спасцігаюць азы працы мытнікаў і міжнародных лагістаў. Вотчына гэтай кафедры пачынаецца ад сімвалічнага шлагбаума і банера са словам «мытня» амаль на пяцідзесяці мовах свету.

– Восьмы паверх ФМА можна з упэўненасцю назваць «мытным», бо выпускаючая кафедра тут адна, – гаворыць загадчык кафедры мытнай справы, доктар гістарычных навук, прафесар Віктар Астрога, які стаў нашым праваднікам па кабінетах. – Тут праходзяць усе нашы ўнутраныя святы, сустрэчы і імпрэзы. Таксама на базе нашых кабінетаў адбываюцца заняткі «школы будучага мытніка» і «школы будучага лагіста-міжнароднік». Кафедра мытнай справы рыхтуе ўніверсальных спецыялістаў, таму гэта дазваляе выпускнікам знайсці сябе ў розных напрамках: мытнай службе, мытным бізнесе, міжнароднай лагістыцы і інш.

Усяго спецыялізаваных кабінетаў у «мытнікаў» сем – іх можна знайсці па шыльдах і эмблеме кафедры. Першы з іх – вучэбна-метадычны – існуе на базе кабінета Віктара Астрогі. Тут знаходзіцца выстава публікацый выкладчыкаў, захоўваюцца прадметы і дакументы, звязаныя з гісторыяй кафедры мытнай справы. Сярод такіх экспанатаў – часопіс «Таможенный вестник» з матэрыялам, які расказвае пра стварэнне кафедры, ключы ад першага яе памяшкання, узнагароды і публікацыі студэнтаў. Асобнае месца займаюць прадметы, па якіх вывучаюць асаблівасці мытнага кантролю гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Фуражкі і курсавая сцягі, якіх у вучэбна-метадычным кабінеце нямала, – галоўныя атрыбуты студэнтаў-мытнікаў. З 2018 года ў навучэнцаў спецыяльнасці «мытная справа» з'яўляюцца ўласныя сцягі. На сцягу цяперашніх першакурснікаў красуе фраза: «Мытная справа – наша справа». Побач таксама захоўваецца касцюм сімвала студэнтаў кафедры – пчалы. Гэты персанаж суправаджае хлопцаў і дзяўчат на ўсе кафедральныя і факультэцкія святы. А белая студэнцкая фуражка з зялёным аколышкам – нязменны і традыцыйны спадарожнік свята «Кадуцэй-Фэст», які кафедра штогод праводзіць у кастрычніку.

Аўдыторыя міжнароднай лагістыкі, якая знаходзіцца побач, спецыялізуецца на пытаннях тэорыі і практыкі гэтага напрамку. Маладыя людзі вывучаюць гісторыю станаўлення міжнароднай лагістыкі, спасцігаюць прынцыпы міжнароднага гандлю, паглыбляюцца ў пытанні міжнародных перавозак грузаў, знаёмяцца з асноўнымі дакументамі, што суправаджаюць міжнародныя патокі тавараў, а таксама разбіраюцца ў асаблівасцях мытнай справы ў кантэксце міжнароднай лагістыкі. Значная частка нагляднага матэрыялу гэтай аўдыторыі – стэнды.

Кабінет мытнага кантролю цікавы экспанатамі, што дэманструюць разнастайныя хітрыкі кантрабандыстаў, з якімі могуць сустрэцца будучыя вартавыя мытнай граніцы. Тут, напрыклад, можна ўбачыць манекен, абкручаны цыгарэтнымі пачкамі, або дзверы легкавой машыны, таксама «ўтрамбаваныя» цыгарэтамі.

Кабінет таваразнаўства і экспертызы – свайго роду наглядны дапаможнік па тых прадметах, якія абавязкова трапяць у поле зроку кожнага мытніка. Стэлажы аўдыторыі ўтрымліваюць розныя віды бытавой хіміі, дзіцячых цацак, шматлікага посуду, прыклады прадуктаў харчавання, прадметаў быту. У яго сценах маладыя людзі вучацца апісваць і класіфікаваць тавар, які праходзіць праз мытню, – посуд, адзенне, вырабы з разнастайных матэрыялаў, сувенірную прадукцыю і да т. п. Гэта патрэбна для таго, каб браць правільную мытную пошліну (не завышаную і не заніжаную). У будучай рабоце гэтых людзей дапамогуць спецыяльныя зборнікі, дзе змяшчаюцца коды апісаных тавараў.

– Уявіце такую сітуацыю. Перад вамі – ручка з фотакамерай. Якім чынам яе класіфікаваць? Як ручку ці як фотакамеру? – задае пытанне Віктар Аляксандравіч. – А ўсё залежыць ад функцыяналу прадмета. Калі гэта фотакамера з функцыямі ручкі – ацэньваем як фотакамеру, калі пісьмовы прыбор з функцыяй здымкі – разглядаем як ручку.

Кабінет гісторыі мытнай справы Беларусі можна назваць музеем, дзе пастаянна ідзе вучэбны працэс і куды завітваюць госці кафедры – школьнікі і педагогі з «мытных» класаў, дзейныя супрацоўнікі і ветэраны мытных органаў. Знаёмства з гэтым месцам і яго абсталяваннем дапамагае студэнтам навучальнага матэрыялу. У гэтай аўдыторыі можна даведацца, якія разнастайныя спосабы перавозкі тавараў праз мяжу выбіралі правапарушальнікі ў розны час. Напрыклад, у 20–30-я гады мінулага стагоддзя шмат спрабавалі праносіць на целе або ў патаемных аддзяленнях адзення, а ў 70–80-я гады кантрабанду хавалі ў хлебе, абутку, посудзе, леках, сантэхнічных запчастках, кансервах. Сёння такімі «схованкамі» выступаюць дзіцячыя цацкі, хлеб, бытавая тэхніка, кнігі, дзверы і шыны аўтамабіляў.

Адметна, што часта незвычайныя рэчы перавозяцца ў мудрагелістых месцах. Віктар Аляксандравіч расказвае гісторыю, што ў канцы мінулага стагоддзя мужчына хацеў перавезці праз мяжу 8 біўняў маманта. А схаваў ён іх… у дровах, падобных да костак формай і афарбоўкай. Выкрыць правапарушальніка дазволіў ручны агляд прычэпа, у якім дровы перавозіліся. Таксама мытнікі нярэдка знаходзяць прадметы, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць: кнігі, посуд, сувеніры, ювелірныя вырабы, узнагароды і нагрудныя знакі рознай вартасці і інш.

На базе спецыялізаваных кабінетаў студэнты ствараюць шматлікія праекты, якія дапамагаюць у вучэбным працэсе. Адным з адметных экспанатаў тут можна назваць муляж Бялыніцкай іконы Божай маці XVIII стагоддзя. Аўтар гэтага метадычнага дапаможніка – выпускніца Дар'я Кузьмянкова – узнавіла структуру іконы і паказала, якім чынам і з якіх матэрыялаў быў выраблены арыгінальны абраз. Значная колькасць навучэнцаў факультэта, дзякуючы магчымасці карыстацца спецыялізаванымі аўдыторыямі, пачынае займацца навуковай дзейнасцю.

Уласным летапісцам кафедры мытнай справы з'яўляецца кабінет міжнароднага мытнага супрацоўніцтва. На гэтай пляцоўцы студэнты знаёмяцца з буйнымі падзеямі ў сферы сусветнай мытнай справы, вывучаюць дзейнасць Сусветнай мытнай арганізацыі і знакавыя дамоўленасці паміж краінамі. Наглядным дапаможнікам для навучэнцаў ужо каторы год служыць форма мытнікаў з розных краін – Расіі, Украіны, Польшчы, Узбекістана, Казахстана і іншых краін.

Пасля агляду кабінетаў для практыка-арыентаванага навучання давайце паглядзім, як студэнты асвойваюць іх матэрыяльна-тэхнічную базу, як працуюць на спецыяльным абсталяванні.

На стале размясціўся прыбор з мудрагелістай для госця назвай «Рэгула М 4003». На ім засяроджана працуе першакурснік Вадзім Васюкевіч. Ён ужо ведае, што падобныя апараты дазваляюць спецыялістам-практыкам праверыць сапраўднасць дакументаў ці грашовых адзінак.

Для адукацыйнага эксперыменту студэнт кладзе пад святло прылады беларускі пашпарт. Момант – і на старонках звыклага і, здавалася б, вывучанага з усіх бакоў дакумента «квітнее» папараць. Маладыя людзі перагортваюць старонкі – і на апошняй з іх разам з кветкай удачы прасвечваецца чырвоная паласа. Колькі яшчэ адкрываецца такіх невядомых звычайнаму чалавеку асаблівасцяў!

Паралельна Віктар Аляксандравіч расказвае пра выпадкі, калі несапраўдныя дакументы былі зроблены якасна, але краіны, грамадзянамі якой называлі сябе падробшчыкі пашпартоў, ніколі не існавала.

Студэнты пачынаюць працаваць з мікраскопам, які дазваляе хутка пераносіць інфармацыю на камп'ютар і кіраваць ёй, напрыклад, павялічваць ці пераварочваць выявы.

Загадчык кафедры адзначае, што нярэдка мытнікі выконваюць функцыі памежнікаў. І гэта чарговы раз даказвае, што такі спецыяліст павінен быць дапытлівым, уседлівым, уважлівым да дробязяў, усебакова развітым, каб у далейшым на гэтым грунтаваліся дадатковыя веды па тым напрамку, з якім выпускнік кафедры захоча звязаць сваё жыццё. А на розум пасля ўсяго ўбачанага чамусьці прыходзіць вядомая ў колах мытнікаў прымаўка: «Мытнік бачыць углыб».

Ірына ІВАШКА

Нядаўна кафедра мытнай справы ФМА заснавала ўласны нагрудны знак «Руплівому». На ўзнагародзе змяшчаецца рэльефная выява супрацоўнікаў мытнай службы, сцяг мытнай службы Беларусі і сцяг БДУ. Такім нагрудным знакам заахвочваюць найлепшых студэнтаў за дасягненні ў навучальнай, навуковай і грамадскай дзейнасці. А першымі яго ўладальнікамі сталі другакурснік Максім Аскерка, трэцякурснікі Кірыл Латан і Аляксей Бадуноў, а таксама чацвёртакурснікі Кірыл Даронін і Аляксандра Рудніцкая.

на практычны досвед

«Фантазія, якая стала навуковым фактам»

Менавіта так сказаў пра крыміналістыку прафесар Аляксандр Васільевіч Лапін. Яго выслоўе знаёмае кожнаму студэнту юрыдычнага факультэта, які хоць раз наведваў крыміналістычны палігон.

Кафедра крыміналістыкі юрыдычнага факультэта БДУ створана ў 1972 годзе заслужаным дзеячам навукі Рэспублікі Беларусь, доктарам юрыдычных навук, прафесарам Андрэем ДУЛАВЫМ. Ён кіраваў кафедрай да 1990 года, падрыхтаваў больш за 50 кандыдатаў і дактароў юрыдычных навук. Апублікаваны звыш 600 яго навуковых прац.

З 1990 па 2016 год кафедрай загадваў кандыдат юрыдычных навук дацэнт Рыгор ШУМАК. У сваёй працы ён надаваў вялікую ўвагу падрыхтоўцы маладых супрацоўнікаў кафедры, пераемнасці навуковых традыцый і метадычнага досведу прадстаўнікоў старэйшага пакалення выкладчыкаў.

Доктар юрыдычных навук прафесар Вячаслаў ШАБАНАЎ узначальвае кафедру з красавіка 2016 года.

Філіял кафедры крыміналістыкі таксама створаны на базе цэнтральнага апарата Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь.

Усе 20 супрацоўнікаў кафедры валодаюць шырокімі тэарэтычнымі ведамі і маюць не менш за пяць гадоў практычнага досведу, а навукоўцы з'яўляюцца членамі навукова-кансультатыўных саветаў пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры, Следчым камітэце, Дзяржаўным камітэце судовых экспертыз. Выкладчыкі вядуць такія дысцыпліны, як: крыміналістыка, юрыдычная псіхалогія, судовая бухгалтэрыя, судовая экспертыза, судовая медыцына і псіхіятрыя, расследаванне злачынстваў у сферы эканамічнай дзейнасці, асновы аператыўна-вышуковай дзейнасці, а таксама шэраг спецыяльных дысцыплін магістратуры.

Кафедра крыміналістыкі – адзін з вядучых навуковых і крыміналістычных цэнтраў краіны. Адной з найважнейшых яе структур з'яўляецца крыміналістычны палігон, які быў заснаваны ў 2016 годзе па ініцыятыве цяперашняга загадчыка кафедры.

Сёлета, з нагоды 50-годдзя кафедры, палігону прысвоілі імя прафесара Андрэя Васільевіча Дулава. Акрамя таго, да гэтай знамянальнай падзеі зняты невялікі дакументальны фільм пра гісторыю кафедры.

– Мы прадаўжальнікі ідэі Андрэя Васільевіча пра практыка-арыентаванае навучанне крыміналістыцы студэнтаў юрыдычнага факультэта. Выкарыстанне толькі тэорыі пры падрыхтоўцы спецыялістаў у сферы юрыспрудэнцыі не адпавядае сучасным рэаліям, таму мы даём і візуальную, і тактыльную інфармацыю. Пасля пераходзім да такога навучання, калі студэнты могуць самі паспрабаваць, адчуць і прадметна ўбачыць сваю будучую працу. Так, напрыклад, на крыміналістычным палігоне, які з'яўляецца часткай працоўнай пляцоўкі кафедры, яны могуць разгледзець імітаваныя сітуацыі: месца забойства, крадзяжу, разбойнага нападу, няшчаснага выпадку і да т. п. Гэта значыць такія сітуацыі, калі трэба разабраць тып здарэння і выканаць неабходныя дзеянні. Спецыфіка работы супрацоўніка праваахоўнай сферы заключаецца ў тым, што яму даводзіцца дзейнічаць у інфармацыйна і эмацыйна насычанай прасторы. Напрыклад, сустрэчы са сваякамі і блізкімі пацярпелых, з ахвярамі, з падазраванымі ці абвінавачванымі. Таму на крыміналістычным палігоне будучыя спецыялісты атрымліваюць практыку такога ўзроўню, вучацца заставацца эмацыйна стабільнымі ў стрэсавых сітуацыях, – распавядае загадчык навучальнай лабараторыі крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз Іван Лузгін.

На палігоне студэнтаў вучаць працаваць з тэхнічнымі сродкамі для правільнай выемкі розных відаў слядоў, аналізаваць і рабіць высновы, каб забяспечыць працэс даказвання. Крыміналістычны палігон уяўляе сабою некалькі імітаваных памяшканняў, дзе можна за 10-15 хвілін памяняць становішча ў залежнасці ад той задачы, якую хоча паставіць выкладчык перад навучэнцамі. Памяшканне можа стаць змадэляваным месцам забойства, махлярства, самагубства і інш.

З мінулага года студэнты навучаюцца таксама ў кабінеце дактыласкапіі, які абсталяваны спецыялізаванымі следчымі наборамі для выяўлення, замацавання і выемкі папілярных узораў слядоў чалавека. У набор уваходзяць спецыяльныя пэндзлі, парашкі, дактаплёнкі, дактакарта, дактыласкапічная фарба, павелічальныя лупы, а таксама абсталяванне для электроннага сканіравання слядоў рук і інш.

У складзе крыміналістычнага палігона яшчэ 4 лабараторыі, кабінет дакументазнаўства, кабінет крыміналістычнай методыкі, дзе вывучаюцца методыкі раскрыцця, расследавання і папярэджання злачынстваў. Ёсць таксама кабінет методыкі раскрыцця, расследавання і папярэджання злачынстваў, звязаных з наркатычнымі рэчывамі.

У навучальнай лабараторыі крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз нам паказалі цікавае абсталяванне. Усяго на кафедры налічваюцца сотні разнастайных прыбораў. Нашу ўвагу прыцягнуў відэакампаратар, які здольны з дапамогай пэўных спектраў асвятлення выявіць утоеныя і забруджаныя элементы на фатаграфіях, дакументах і запісках. А яшчэ – мікраскоп для даследавання мікрачасціц і люмінесцэнтны мікраскоп для даследавання дакументаў, грашовых сродкаў, гільзаў, патронаў. На гэтым мікраскопе ў мікраструктурах пашпарта грамадзяніна РБ можна нават убачыць подпісы распрацоўшчыкаў дызайну пашпарта!

Апрача абсталявання на сценах кабінетаў можна ўбачыць ілюстрацыі і навучальныя схемы. Але і яны маюць свой сакрэт. Гэта інтэрактыўныя ілюстрацыі, студэнт, паднёсшы да іх смартфон, можа атрымаць пашыраную інфармацыю пра той ці іншы аспект крыміналістыкі, які яго цікавіць.

– Крыміналістыка вельмі дарагая сфера. Бо шэраг інфармацыі, які ўтрымлівае сляды злачынства, выходзіць далёка за межы ўспрымання органаў пачуццяў чалавека. Злачынствы здзяйсняюцца ў мінулым, а расследуюцца – у сучаснасці і будучыні. Абсталяванне дапамагае паскорыць працэс раскрыцця і расследавання злачынстваў. Акрамя таго, крыміналістыка з дапамогай адпаведных тэхнічных сродкаў дазваляе папярэджваць злачынствы і не даваць ім здзяйсняцца. Гэта дорага, але чалавечае жыццё несувымерна даражэйшае, – гаворыць Іван Іванавіч. – Мы не проста навучаем студэнтаў крыміналістыцы, мы навучаем крыміналістычнаму мысленню і аналізу. Каб яны не толькі глядзелі, але і бачылі. Мы імкнёмся падрыхтаваць такога спецыяліста, які зможа якасна выкарыстоўваць крыміналістычныя веды для прадухілення злачынстваў, напрыклад, зможа вызначыць падробленыя дакументы, пячаткі і да т. п. Веды такога роду аднолькава карысныя і будучаму юрысту на прадпрыемстве, і следчаму, і адвакату, і іншым. Мы ўвесь час папаўняем і развіваем навучальную базу нашага крыміналістычнага палігона, закупляем для яго новае сучаснае абсталяванне, дакументы. Да прыкладу, кафедра валодае поўным комплексам усіх відаў пашпартоў і ўсіх грашовых знакаў свету.

Вядома, і да з'яўлення крыміналістычнага палігона для студэнтаў-юрыстаў былі арганізаваны асобныя формы практыкі, лабараторныя працы. Але яго наяўнасць дазваляе комплексна навучаць студэнтаў і развіваць іх прафесійныя навыкі. Акрамя таго, студэнты абавязкова атрымліваюць практычныя веды ў рэальных умовах: наведваюць суды, выязджаюць на месцы здарэнняў.

На факультэце пашыраецца практыка выкладання юрыдычнай псіхалогіі. І пачынаецца яна з растлумачэння таго, хто такі аператыўны работнік, пракурор. Паказваецца, якім чынам трэба правесці тыя ці іншыя следчыя дзеянні. На палігоне студэнты могуць нават адпрацаваць мадэль допыту. Гэта адбываецца ў асобным памяшканні, у якім адзін студэнт выконвае ролю следчага, а іншы – падазраванага. Астатнія студэнты па відэакамерах сочаць за працэсам. Вывучаецца псіхалогія паводзін падазраванага і яго схема абароны сябе.

– Для таго, каб развівацца ў прафесіі, студэнт павінен сам быць псіхалагічна падрыхтаваным і ўстойлівым, павінен мець добры ўзровень арганізацыі сябе і навакольных. Таму мы з калегамі і фарміруем гэту стрэсаўстойлівасць у студэнтах. Яшчэ адна важная якасць – высокі ўзровень адаптыўнасці да ўмоў, бо падчас працы маладыя спецыялісты могуць сутыкнуцца з самымі непрыемнымі рэчамі, – гаворыць загадчык кафедры крыміналістыкі Вячаслаў Шабанаў.

На крыміналістычным палігоне заняткі праводзяцца галоўным чынам для студэнтаў 3 і 4 курсаў. Для студэнтаў, якія жадаюць вывучаць і практыкавацца ў крыміналістыцы, на кафедры арганізаваны гурток. У ім на дадзены момант займаюцца каля 60 чалавек.

Крыміналістычны палігон з'яўляецца не толькі пляцоўкай для практыкі, але і гісторыка-прававой прасторай для вывучэння гісторыі выкладання крыміналістыкі ў Рэспубліцы Беларусь і развіцця крыміналістычнай тэхнікі. Тут можна ўбачыць даволі старыя «савецкія» дыктафоны і фотаапараты, а таксама сапраўдныя прылады, вынятыя ў злачынцаў. У год на палігоне праходзіць каля сарака экскурсій.

Загадчык кафедры крыміналістыкі падзяліўся планамі пра стварэнне на палігоне памяшкання для мадэлявання месцаў злачынстваў, звязаных з рабаваннем, разбоем, разнастайнымі відамі крадзяжу, злачынствамі супраць чалавека. Асобную ўвагу кафедра мае намер надаць паглыбленаму практычнаму навучанню студэнтаў раскрыццю і расследаванню кіберзлачынстваў і злачынстваў у сферы эканамічнай бяспекі.

Ганна КАЗАКОВА

УНІВЕРСІТЭТ
22 лістапада 2022 года, № 12 (2263)

Крок са святла ў цемру

Кандыдат біялагічных навук дацэнт кафедры генетыкі біялагічнага факультэта БДУ Васіль ГРЫНЁЎ апублікаваў больш за 140 навуковых прац і на дадзены момант з'яўляецца адным з самых рэйтынгавых супрацоўнікаў факультэта.

На рахунку Васіля Віктаравіча звыш 20 актаў укаранення вынікаў выканання НДР у навучальны працэс і навуковую практыку, патэнт і мноства навукова-даследчых праектаў, якія ўваходзілі ў праграмы БРФФД (Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў), ДКПНД (Дзяржаўная комплексная праграма навуковых даследаванняў), ДПНД (дзяржаўная праграма навуковых даследаванняў) і INTAS. Цяпер навуковец засяроджаны на напісанні доктарскай дысертацыі «Заканамернасці сплайсінгу малекул РНК генаў чалавека, актыўных у клетках гемапаэтычнага паходжання».

– Распавядзіце, калі ласка, пра Вашу доктарскую дысертацыю.

– Уявіце сабе вялікую тоўстую кнігу старонак на 500. Калі паспрабаваць запісаць у такой кнізе ўсю генетычную інфармацыю, якая захоўваецца ў нашым геноме, то мы атрымаем амаль 4,5 тыс. тамоў суцэльнага тэксту. Гэта шмат, ці не так? І чытаецца гэты тэкст адмысловым чынам. Звычайны твор мы чытаем слова за словам, сказ за сказам, абзац за абзацам. А генетычная інфармацыя, якая захоўваецца ў нашых клетках, чытаецца па-іншаму. Першапачаткова яна счытваецца вялікімі кавалкамі, пасля чаго гэтыя кавалкі рэжуцца і склейваюцца ў іншай паслядоўнасці. Вяртаючыся да аналогіі з кнігай, калі б чытанне такой кнігі ішло ў клетцы, то яна ўвесь час перараблялася б так, што розныя чытачы вынеслі б з яе зусім розныя рэчы. У клетцы пры чытанні інфармацыя ўвесь час фрагментуецца і сшываецца ў новыя часткі, раздзелы і тамы. Вось я якраз і зацікавіўся тым, як адбываецца гэта чытанне і ўтварэнне канчатковых варыянтаў генетычнага тэксту, якія мы і называем малекуламі спелых РНК. А той працэс, які з частак састыкоўвае новы канчатковы тэкст, мы называем сплайсінгам.

Сплайсінг быў адкрыты Філам Шарпам яшчэ ў 1980-х гадах, за што ён атрымаў Нобелеўскую прэмію. Гэта складаны працэс, які кіруецца ў клетцы шматкампанентнымі малекулярнымі машынамі. І мы не да канца разумеем правілы, па якіх працуюць такія малекулярныя машыны, як выбіраюцца кавалкі інфармацыі, якія захоўваюцца, якія выдаляюцца, як аб'ядноўваюцца ў канчатковы тэкст тыя, якія захоўваюцца. Высвятленне гэтых правіл – адзін з маіх навуковых інтарэсаў. Пры гэтым мы засяродзіліся не на любых клетках чалавека, а на лейкозных (ракавых) і нармальных клетках крыві. Мой асобны інтарэс – высветліць, як уплываюць на чытанне генетычнай інфармацыі і сплайсінг гены лейкозагенезу. Да такіх генаў адносяць, як правіла, мутантавыя гены, адказныя за ўзнікненне і развіццё лейкозу ў чалавека.

– Чаму Вы абралі менавіта гэты напрамак у сваім даследаванні?

– Таму што, як вывысвятляецца, для нашага арганізма найважнейшым з'яўляецца не столькі тое, якая там генетычная інфармацыя маецца, колькі тое, як яна счытваецца і рэалізуецца. Бывае, што ген і пашкоджаны мутацыяй, але ўключаюцца механізмы, у тым ліку звязаныя са сплайсінгам, якія кампенсуюць паломку. Да разумення важнасці працэсаў, звязаных з рэалізацыяй генетычнай інфармацыі, я прыйшоў, вядома, паступова. Можна лічыць, што я пачаў займацца гэтай працай яшчэ ў студэнцкія гады. Так атрымалася, што ўжо на другім курсе я шукаў навуковую лабараторыю, у якую можна было б патрапіць студэнту біялагічнага факультэта і рабіць курсавыя, а потым і дыпломную працу. У канчатковым выніку я патрапіў у Інстытут гематалогіі і пераліванння крыві, цяпер гэта Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій.



На малюнку – лейкозныя і нармальныя клеткі крыві чалавека

Доктар медыцынскіх навук прафесар Міхаіл Пятровіч Патапнёў быў кіраўніком не толькі лабараторыі, але і аддзела, дзе займаліся вывучэннем супрацьпухліннага імунітэту. Ён прапанаваў мне засяродзіцца на гэтай сферы. У выніку мае дыпломная праца і кандыдацкая дысертацыя былі звязаны з вывучэннем узаемадзеянняў паміж лейкозныімі клеткамі і нармальнымі клеткамі імуннай сістэмы (якія паходзяць, дарэчы, таксама з клетак крыві). І потым, ужо пасля абароны кандыдацкай дысертацыі, я працягнуў працу, якую вёў да гэтага, але дапоўніў яе малекулярна-генетычнымі даследаваннямі механізмаў рэалізацыі генетычнай інфармацыі ў лейкозных і нармальных клетках крыві.

– Што самае цікавае ў Вашай працы?

– Цікавае ўсё, але ёсць прыярытэтныя ідэі. Цяпер адной з такіх ідэй, над якой я і мае калегі актыўна працуем, з'яўляецца пошук у лейкозных клетках малекулярных структур, якія былі б прывабныя для клетак імуннай сістэмы, каб яны маглі эфектыўна распазнаваць ракавыя клеткі і знішчаць іх.

Справа ў тым, што ў наш час для лячэння лейкозаў, а таксама іншых формаў раку ўсё больш інтэнсіўна выкарыстоўваюць так званую CAR-тэрапію. Яна спалучае ў сабе магчымасці клетачнай і малекулярнай біялогіі, а таксама генетычнай інжынерыі. Для гэтага генна-інжынерным шляхам змяняюць адмысловую групу клетак крыві, якія называюцца Т-лімфацытамі, так, каб яны сталі агрэсіўнымі супраць лейкозных клетак. Іх змяшчаюць у арганізм чалавека, і гэтыя клеткі даволі эфектыўна знаходзяць і знішчаюць лейкозныя.

Але для таго, каб яны іх знайшлі, трэба ведаць, чым лейкозныя клеткі адрозніваюцца ад нармальных. Тут ёсць пэўныя праблемы. Лейкозныя клеткі, як і іншыя ракавыя, на працягу свайго развіцця імкнуцца паводзіць сябе даволі ціха ў дачыненні да імуннай сістэмы, не раздражняць яе. У іх фактычна няма нічога, што імунная сістэма распазнавала б як асабліва чужароднае, а нават калі такія структуры ў ракавых клетак і з'яўляюцца ў пачатку зараджэння, то яны хутка змяняюцца і эвалюцыянуюць, каб пазбавіцца ад такіх структур. Так што сама па сабе ідэя выкарыстання генетычна зменены­х Т-лімфацытаў добрая, але трэба адшукаць «ахілесаву пяту» лейкозных клетак – штосьці, што будзе адрозніваць іх з імуналагічнага пункту гледжання ад нармальных клетак крыві. І адна з нашых ідэй заключаецца ў тым, што мы можам знайсці гэтыя слабыя месцы лейкозных клетак, вывучаючы сплайсінг, чым мы і займаемся ў наш час.

– Вы працавалі ў розных краінах, якая са стажыровак паўплывала на Вас больш за ўсё?

– Так, я стажыраваўся і працаваў у Германіі, Люксембургу, Нарвегіі, Вялікабрытаніі і Аўстрыі. У некаторыя краіны, напрыклад, у Францыю, я хутчэй зазіраў у якасці госця.

Першая мая паездка ў Германію, яшчэ ў двухтысячных, уразіла мяне больш за ўсё. Гэта была праграма INTAS, па якой вылучаліся гранты для навукоўцаў з былога Савецкага Саюза, каб яны маглі займацца даследаваннямі і ў сябе на радзіме, і некаторы час працаваць у еўрапейскіх лабараторыях.

У той час арганізацыя навукова-даследчай працы ў нас і ў Германіі істотна адрозніваласа. Там, калі мне былі патрэбныя нейкія рэагенты, то ўжо праз дзень-два яны былі ў мяне на стале, а ў нас даводзілася чакаць месяцамі, што, натуральна, вельмі моцна адбівалася на эфектыўнасці рашэння задач. Бо ў фундаментальнай навуцы кожны новы крок – гэта крок у цемру: ты знаходзішся ў коле, асветленым наяўнымі ведамі, а што там, за мяжой святла і цемры, ты можаш толькі меркаваць і ніхто не можа ацаніць правільнасць тваёй здагадкі. Таму ў навуцы ніхто не гарантуе поспех наступнага кроку. Заўсёды ёсць рызыка спатыкнуцца і патрапіць у балота, а каб выбрацца з яго і знайсці наступную, больш надзейную, сцяжынку, трэба час. І чым хутчэй я магу выправіць памылку (напрыклад, хутка атрымаць новыя рэагенты для новага эксперыменту), тым хутчэй я прайду гэты шлях. А гэта можна рабіць, калі добра развітая інфраструктура, якая абслугоўвае навуковую сферу. У Германіі мноства кампаній, якія вырабляюць тыя самыя рэагенты. Там развітая лагістыка, няма бюракратызацыі працэсу атрымання матэрыялаў. Гэта адбывалася проста: пішаш на паперы спіс, аддаеш матэрыяльна адказнаму, і далей гэта не твае клопаты. На наступны дзень яны будуць ляжаць у скрынцы на стале, што, вядома, вельмі здзіўляла.

Яшчэ здзіўляла пастаянная камунікацыя, пастаянныя «лабмітынгі», калі ўся лабараторыя сустракаецца і абмяркоўвае бягучыя вынікі, што атрымалася, а што не, які наступны будзе крок. Гэта праходзіла мінімум раз у тыдзень, і калі ўсе сустракаліся, то ці па чарзе распавядалі, што паспелі зрабіць за тыдзень, ці прадстаўлялі больш грунтоўныя даклады за нейкі прамежак часу. Былі таксама рэгулярныя інстытуцкія сустрэчы, калі, напрыклад, раз у месяц увесь інстытут збіраўся, і хтосьці адзін рабіў вялікі даклад пра працу, праробленую за паўгода. Шмат запрошаных навукоўцаў, лектараў, якія прыязджалі з іншых краін праводзіць спецыялізаваныя семінары і г. д. Часам гэта нават стамляла, таму што толькі сышоў з аднаго лабмітынгу ці лекцыі, як шэф адразу кліча на наступны. І я, бывала, спецыяльна прапускаў такія мерапрыемствы, таму што хацелася папрацаваць самому, атрымаць свае ўласныя вынікі. Абмен інфармацыяй заўсёды ішоў вельмі інтэнсіўна. І калі я вярнуўся сюды, то са сваімі студэнтамі, магістрантамі і аспірантамі арганізоўваў штосьці падобнае. У БДУ мая асноўная праца – выкладчыцкая, і яна забірае шмат часу. Тым не менш я ўсё-такі камунікацыю наладзіў і нават спрабаваў распаўсюдзіць на кафедры, але мае калегі гэта ўспрынялі без асаблівага энтузіязму. Падобныя сустрэчы робяцца, каб як мага раней выявіць сваю памылку і прыдумаць, як яе выправіць.

У Англіі я працаваў некалькі разоў. Апошні раз мяне туды запрасілі як прафесара па біяінфарматыцы. Але не лекцыі чытаць, а вырашаць задачы, звязаныя з аналізам вялікіх медыка-біялагічных даных.

З Нарвегіяй у нас быў праект хутчэй адукацыйнага плана, у якім я быў як шараговы ўдзельнік. Трэба было распрацаваць сумесную навучальную праграму па міждысцыплінарнай падрыхтоўцы магістрантаў і аспірантаў для працы з вялікімі біялагічнымі і медыцынскімі данымі. Праект прадугледжваў распрацоўку камбінаванай праграмы, дзе быў і анлайн-кампанент. У рамках гэтага праекта я нават ездзіў у Нарвегію запісваць відэалекцыі ў Green Studio Нарвежскага ўніверсітэта прыродазнаўчых навук. Тады гэта быў мой першы падобны досвед, і я зразумеў, што гэта не так проста.

У 2018 годзе ў рамках праекта PRINTEL у мяне была невялікая стажыроўка ў Аўстрыі ў горадзе Грац, якая праходзіла ў Інстытуце міжнароднага менеджменту Універсітэта прыкладных навук Ёанеум і была накіравана на вывучэнне метадаў гібрыднага навучання. Гэта навучанне студэнтаў не толькі аўдыторна, але і на разнастайных платформах тыпу Moodle. Цяпер, пасля кавіду, у нас гэта распаўсюджана, але калі я праходзіў стажыроўку, то падобныя фарматы толькі пачыналі выкарыстоўваць. Потым я праводзіў у нас у БДУ цыкл семінараў для супрацоўнікаў і выкладчыкаў, як можна арганізаваць і праводзіць такое навучанне.

– Вы падтрымліваеце сувязь з замежнымі калегамі?

– Цяпер афіцыйных праектаў у мяне з імі няма, але камунікацыя захоўваецца. Адзін з навукоўцаў, з якімі я даўно знаёмы, прафесар Олаф Хайдэнрайх, працуе ў Нідэрландах кіраўніком лабараторыі ў Дзіцячым анкалагічным медыцынскім цэнтры імя прынцэсы Максімы ва Утрэхце. Гэта адзін з найбуйнейшых у свеце навуковых цэнтраў такога роду. І зусім нядаўна ў нас выйшаў сумесны артыкул у часопісе Blood, прысвечаны таму, як пры развіцці лейкозаў адбываецца пераход з адной формы хваробы ў іншую. Часопіс выдаецца Амерыканскім грамадствам гематолагаў, і ў галіне гематалогіі (навукі, якая вывучае кроў) ён з'яўляецца самым прэстыжным. Гэта яшчэ і мой улюбёны часопіс. У студэнцкія і аспіранцкія гады, калі я пачаў займацца навуковай працай, прафесар Патапнёў параіў мне звярнуць увагу на гэта выданне, што я і зрабіў, і заахвоціўся да чытання публікаваных там артыкулаў.

У мяне і раней было некалькі невялікіх публікацый у гэтым часопісе, але такая маштабная ўпершыню. Гэты артыкул выдатна ілюструе, наколькі складанымі сталі задачы сучаснай навукі. Іх часцяком немагчыма вырашыць не тое што ў адзіночку, але нават цэлымі групамі, лабараторыямі і інстытутамі. У такіх выпадках збіраюцца кансорцыумы з розных інстытутаў і розных краін, каб падзяліць складаную задачу на падзадачы і размеркаваць іх паміж тымі, хто профі ў той ці іншай сферы. Канкрэтна ў згаданым артыкуле ў суаўтарстве было 57 чалавек з 7 краін і 20 інстытутаў. Вырашалася гэта задача 10 гадоў, і яе рашэнне дае шанцы, што рэцыдывы лейкозаў (аднаўленне хваробы пасля, здавалася б, паспяховага пярвічнага лячэння) стануць лячыцца эфектыўней.

– Па сваёй сутнасці Вы больш даследчык ці выкладчык?

– Як па мне, навука для выкладчыка БДУ павінна ўсё ж такі стаяць на першым месцы. Ён павінен быць у першую чаргу навукоўцам, які атрымлівае новыя веды і павінен абавязкова гэтыя веды распаўсюджваць. Для распаўсюджання ёсць шмат спосабаў: часопісныя публікацыі, кнігі, выкладанне, удзел у навуковых канферэнцыях... Таму я выпрацаваў для сябе такое стаўленне да працы, што я ў першую чаргу навуковец, які атрымлівае новыя веды, інтэгруе іх ва ўжо існую сістэму навуковых ведаў, а потым імкнецца перадаць гэтыя веды іншым людзям, асабліва студэнтам.

Ганна КАЗАКОВА

«М.І.Р. – 2022»: форум лідарства

Ва ўніверсітэце прайшоў шосты Міжнародны моладзевы форум «М.І.Р. – Моладзь. Інтэграцыя. Развіццё».

Асноўная мэта галоўнага мерапрыемства Студэнцкага савета БДУ – абмен вопытам паміж студэнцкімі арганізацыямі розных краін. Сёлета Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб'яднаў 50 студэнтаў з ВНУ Беларусі, Расіі, Казахстана і Узбекістана. Гасцямі форуму сталі прадстаўнікі МДЛУ (Мінск), ГДУ імя Францыска Скарыны (Гомель), МДУ імя М. В. Ламаносава (Масква), РУДН (Масква), Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Ташкенцкага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, Тульскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Л. М. Талстога і інш. Таксама геаграфію «М.І.Р.»у складаюць універсітэты Албаніі, Аўстрыі, Азербайджана, Кітая, Японіі, Германіі, Грэцыі, Казахстана, Кыргызстана, Славакіі, Сербіі, Славеніі і Нідэрландаў.

З вітальным словам да гасцей форуму звярнуўся рэктар БДУ Андрэй Кароль:

– Вы знаходзіцеся не на звычайнай навуковай канферэнцыі ці мерапрыемстве традыцыйнага характару. Тут няма адзінага прамоўцы, які будзе трансліраваць ісціну, а іншыя – яго слухаць. Нездарма кажуць: калі хочаш навучыць чалавека – дай навучыцца самому. Таму, каб сёння выхаваць чалавека, які будзе ўмець думаць, параўноўваць, камунікаваць, патрэбны не маналог, а дыялог. Дыялог па гарызанталі – тое, што чакае вас тут. Форум – тая пляцоўка, дзе чалавек можа раскрыць сябе. Дзякуючы гэтаму, вярнуўшыся ў свае ўніверсітэты, вы зможаце быць «адкрывальнікамі» для сваіх акадэмічных сяброў.

Кожны год актыўнасці форуму «М.І.Р.» звязаныя з пэўнай ключавой тэмай. Так, ранейшыя міжнародныя сустрэчы былі прысвечаны эвалюцыі вышэйшай адукацыі, стагоддзю БДУ і самарэалізацыі студэнтаў. У гэты раз удзельнікі разглядалі тэму «Перспектывы развіцця студэнцкага лідарства ва ўмовах сучаснай вышэйшай школы».

Традыцыйна заняткі адбываліся ў фармаце творчых майстэрняў, падчас якіх уцягваліся ў работу ўсе ўдзельнікі. Адметнасцю стала тое, што тэорыя падавалася нібыта ў «фонавым рэжыме» і абавязкова замацоўвалася на практыцы. Маладыя людзі абмяркоўвалі псіхалагічныя аспекты лідарства, пытанні карпаратыўнай культуры, засвойвалі навыкі нязмушаных гутарак і інш. А яшчэ – падзяліліся вопытам выкарыстання інструментаў для выбудоўвання эфектыўнай работы сеткавага ўзаемадзеяння паміж органамі студэнцкага сумеснага кіравання.

Стартам адукацыйных семінараў стаў майстар-клас «Медыятэхналогіі ў жыцці сучаснага студэнта». На сустрэчы маладыя людзі разгледзелі праблемы інтэрнэту, асабліва тое, як сучасны чалавек можа быць прадстаўлены ў сацыяльных сетках, закранулі некаторыя аспекты сеткавага этыкету. Стрыжнёвай тэмай стала стварэнне і прасоўванне відэакантэнту, паколькі гэта форма падачы інфармацыі прываблівае сучаснага медыяспажыўца. Разам з тым прадстаўнікі розных універсітэтаў падзяліліся вопытам вядзення блогаў студэнцкіх арганізацый. Актывісты адзначылі, што найбольш любімым фарматам атрымання кантэнту з'яўляецца гісторыя з жыцця. Таксама лідары абмеркавалі станоўчыя і адмоўныя бакі вытворчасці відэакантэнту, разабралі адрозненне паміж віруснымі і рэкламнымі ролікамі. І напрыканцы сустрэчы знялі ўласныя ролікі, прысвечаныя форуму.

На сустрэчы «Псіхалагічныя аспекты арганізацыйнага лідарства» ўдзельнікі разбіраліся ў складніках асабістай эфектыўнасці. Маладым людзям расказалі, што галоўны складнік лідарства – уменне правільна ставіць мэты. А майстар-клас «Майстэрства Small Talks у сістэме студэнцкага самакіравання» навучыў лідараў складаць псіхалагічны партрэт суразмоўцы для далейшай ацэнкі магчымасцяў кандыдатуры для працы ў студэнцкай арганізацыі.

Заключны дзень мерапрыемства адкрыўся воркшопам, прысвечаным праектнай дзейнасці органаў студэнцкага сумеснага кіравання. Запрошаным госцем сустрэчы стаў загадчык аддзела праектнай дзейнасці Цэнтральнага камітэта БРСМ Уладзіслаў Дубіцкі. Прамоўца расказаў слухачам пра 20 асноўных і распаўсюджаных памылак, з якімі можна сутыкнуцца падчас распрацоўкі праекта, патлумачыў, што такое карта рызыкі і як дзейнічаць, калі праблемы ўсё ж з'явіліся. Пасля семінара актывісты дапрацоўвалі свае праекты і рыхтавалі іх прадстаўленне. Заключным этапам форуму стала абарона ідэй маладзёжных лідараў. Так, студэнты прадставілі платформу StudIN, студсаветаўскі ўзаемны абмен праграм «С.В.О.П.», Student cooperation network SCope, сайт-платформу STUDsocial і анлайн-платформу PROstudents. Задача кожнага з праектаў – распрацаваць спосаб эфектыўнага міжнароднага супрацоўніцтва студэнцкіх арганізацый, інтэрактыўную платформу, якая забяспечыць устойлівы абмен вопытам у рамках міжнароднага сеткавага супрацоўніцтва органаў студэнцкага самакіравання.

Таксама форум стаў пляцоўкай для працоўных сустрэч Студэнцкага савета БДУ з моладзевымі арганізацыямі-ўдзельніцамі мерапрыемства. Так, актывісты абмеркавалі сумесныя форумы і канферэнцыі са студэнцкім клубам «Самакіраванне па-за межамі» Фінансавага ўніверсітэта пры Урадзе Расійскай Федэрацыі, студэнцкім саветам Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў і саветам навучэнцаў Тульскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Л. М. Талстога. Акрамя таго, на сустрэчах падпісалі дамовы аб супрацоўніцтве і ўзаемадзеянні паміж органамі самакіравання са студэнцкім саветам Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава і студэнцкім саветам факультэта міжнародных адносін Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Кацярына Купрыенка, студэнтка факультэта міжнародных адносін Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, актывіст студэнцкага савета:

– Нягледзячы на тое, што нашы арганізацыі пераследуюць аднолькавыя мэты, паміж імі існуе розніца – найперш у сістэме кіравання. Так, у СПбДУ прадстаўнічы орган, студэнцкі савет, складаецца з дзвюх структур: вялікага і малога (факультэцкага) студсаветаў, якія дзеляцца на некалькі камітэтаў. Дэлегіраванне абавязкаў у БДУ і СПбДУ адбываецца па-рознаму, таму нашым органам студэнцкага кіравання было карысна абмяняцца вопытам. Праграма форуму была вельмі насычанай, але найбольш мне запомнілася работа над групавым праектам. Кожны ўдзельнік каманды прадстаўляў сваю ВНУ, у кожнага было ўласнае бачанне таго, як павінна ажыццяўляцца работа ў студэнцкіх арганізацыях. Аб'яднаўшы ўсё гэта, мы змаглі прапанаваць ідэі праекта па аптымізацыі міжуніверсітэцкіх сувязяў.

Форум «М.І.Р.» для мяне – найперш магчымасці. Магчымасці здабыць новыя знаёмствы, даведацца шмат карыснай інфармацыі ад вопытных выступоўцаў і, канешне, убачыць Мінск і БДУ.

Арсеній Судоргін, студэнт факультэта «Вышэйшая школа кіравання», старшыня практыка-арыентаванага студэнцкага клуба «Самакіраванне па-за межамі» Фінансавага ўніверсітэта пры Урадзе Расійскай Федэрацыі:

– «М.І.Р» дазволіў нам разабрацца ў асаблівасцях студэнцкага сумеснага кіравання Беларусі і Расіі: структуры, іерархіі, узаемадзеянні з кіраўніцтвам універсітэта, кадравым складзе. А яшчэ дапамог згенерыраваць нямала ідэй, якія можна рэалізаваць у клубе, і падказаў, як выправіць недахопы, з якімі сутыкаецца моладзь, улічыўшы вопыт сяброў з розных ВНУ.

Запомніліся воркшопы. Шматдзённы фармат правядзення форуму даў карысныя веды з розных галін: прамоўніцкага майстэрства, праектнай дзейнасці, арганізацыі мерапрыемстваў і іншых. Праграма дазволіла сумясціць атрыманне практычных ведаў і знаёмства з Мінскам і культурай Беларусі. Але найвялікшая асаблівасць для мяне – тое, што перад удзельнікамі выступалі студэнты, што ўжо з'яўляюцца прафесіяналамі і маюць вялікі практычны вопыт у тым, чым займаюцца.

Станіслаў Краско, намеснік старшыні Студэнцкага савета БДУ, кіраўнік каманды адукацыйнага напрамку форуму:

– «М.І.Р» адначасова зараджае энергіяй і дае практыка-арыентаваныя веды. І галоўнае – за час форуму ўдзельнікі аб'ядноўваюцца і пераймаюць адзін у аднаго веды, якія можна прымяняць для ўдасканальвання работы органаў студэнцкага самакіравання.

Юлія Кунахавец, першы намеснік сакратара пярвічнай арганізацыі БРСМ БДУ, кіраўнік адукацыйнага напрамку форуму:

– Форум для мяне – гэта неабдымная адказнасць і такія ж эмоцыі, арганізацыя майстар-класаў, узаемадзеянне са спікерамі, магчымасць рэалізаваць усе тыя ідэі для нашых гасцей і сяброў у рамках асноўнай тэмы. Вядома, гэта і атмасфера, што панавала ўвесь тыдзень, і станоўчыя эмоцыі, і падтрымка ад кожнага з удзельнікаў і арганізатараў. Магу з упэўненасцю сказаць, што гэта былі 4 месяцы плённай падрыхтоўкі і асаблівы тыдзень з насычанай праграмай.

Яна Слуцкая, студэнтка факультэта бухгалтарскага ўліку Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, актывістка:

– Мы рады, што сёлета мерапрыемства праходзіла ў афлайн-фармаце, «ужывую». Гэта, як мне падаецца, значна эфектыўней, чым анлайн. Пасля форуму плануем прымяняць атрыманыя тут веды на практыцы, а таксама ўмацоўваць і развіваць студэнцкае супрацоўніцтва па розных напрамках. У далейшым хацелася б зрабіць большы ўхіл на навуковую дзейнасць, не забываючы пры гэтым пра грамадскую.

Ірына ІВАШКА

УНІВЕРСІТЭТ
22 лістапада 2022 года, № 12 (2263)

«Жыццё спартсмена такое: сёння ты пераможца, а заўтра ў цябе ніхто не верыць»

Павел СУШКОЎ – футбаліст рэзервовай каманды «Энергетык-БДУ». Вучыцца ў Інстытуце бізнесу БДУ на спецыяльнасці «кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі».

Студэнт прызнаецца, што футбол не проста захапленне, а тое асаблівае для яго, што ён хацеў бы пранесці праз усё жыццё. Ёсць і некалькі важных для яго навучальных дысцыплін, адна з такіх – вэб-дызайн. Па словах Паўла, гэта тая сфера, у якой ён бачыць сваю будучыню пасля футбольнай кар'еры. Але пакуль што на першым месцы футбол.

– Лічу, што чалавек не павінен сабе ставіць ніякіх абмежаванняў у жыцці, а імкнуцца развіваць сябе ў розных сферах. Дызайн, напрыклад, раскрывае ўва мне асобу і творчы патэнцыял. Вядома, сумяшчальнасць футбола з вучобай – пытанне адкрытае. Часам мне вельмі складана, але імкнуся на кожны дзень правільна размяркоўваць заданні і здаваць працы своечасова. Парой прашу выкладчыкаў «заплюшчыць вочы» на мае пропускі з-за трэніровак. А вось іх я якраз імкнуся не прапускаць, яны вельмі важныя для мяне. Калі атрымліваецца распланаваць свой дзень правільна, то ўсё можна паспець. У цэлым, тое, што мне трэба было ад універсітэта, я атрымліваю ў БДУ, – гаворыць паўабаронца «Энергетыка-БДУ».

Павел лічыць, што заняткі футболам выхавалі ў ім шмат станоўчых якасцяў: ён стаў больш характарным, у добрым сэнсе няўступлівым, зацятым, навучыўся ўзаемадзейнічаць у калектыве.

– У дзяцінстве гульня ў футбол давала вельмі шмат станоўчых эмоцый, зносіны з аднагодкамі, дапамагала знайсці сяброў. Спаборніцкі складнік мяне моцна запальваў, а сама канцэпцыя каманднай гульні па духу мне вельмі блізкая. Падчас гульні я атрымліваю асалоду, – дзеліцца студэнт.

З роднай Оршы 14-гадовы футбаліст пераехаў у Брэст, дзе выступаў за «Дынама». Ён успамінае той час з гонарам. Па словах Паўла, канкурэнцыя ў камандзе была высокай.

– У Оршы пачынаўся мой футбольны шлях. З самага дзяцінства гуляў з сябрамі ў двары, як і многія дзеці ў нашай краіне. Сябар прапанаваў мне пайсці на прафесійную трэніроўку. Як цяпер памятаю, на мне была форма футбольнага клуба «Барселона», на майцы была напісана прозвішча ўругвайскага футбаліста Луіса Суарэса. Пасля трэніроўкі мяне паклікаў настаўнік – я проста быў на сёмым небе ад шчасця. Мне і тады, і дагэтуль падабаецца любое ўзаемадзеянне ў калектыве, гульня ў камандзе.

У 14 гадоў я паступіў у навучальны цэнтр акадэміі футбольнага клуба «Дынама-Брэст». Пераехаў ад бацькоў, пачаў жыць самастойна. Вучоба ў акадэміі «Дынама» – адна з самых яркіх падзей у маім жыцці. Там я прабыў з 14 да 17 гадоў. Упэўнены, што гэта адна з найлепшых акадэмій Беларусі. Барацьба за месца ў складзе і нават проста за знаходжанне ў ёй была вельмі сур'ёзнай. Выхавальнікі, дзеці – ды і ў цэлым увесь калектыў – былі вельмі класнымі. Цяпер з гонарам успамінаю і цяжкасці, і ўрокі, якія прыйшліся на той час. Вядома, было і шмат вясёлых гісторый. Жыццё спартсмена такое, што сёння ты пераможца, а ўжо заўтра ў цябе ніхто не верыць. З гэтым трэба спраўляцца і ісці далей. Такое жыццё футбольнага гульца, – распавядае Павел. – У 18 гадоў я прыняў для сябе даволі важнае рашэнне, пра якое не шкадую і цяпер: вырашыў пераехаць з Брэста ў Мінск. Мне паступіла прапанова стаць гульцом каманды «Энергетык-БДУ». І якраз у той момант мне ўжо трэба было пераходзіць на «дарослы» ўзровень. Мяне даволі цёпла прынялі, і я хутка асвоіўся ў калектыве.

Трэніраваўся і з першай камандай, і з «дублем». Трэнеры і члены каманды добра ставяцца да пачаткоўцаў, цёпла іх прымаюць. Думаю, гэта таму, што тут амаль усе гульцы маладога ўзросту. «Энергетык-БДУ» – клуб, які добра развівае моладзь, дае магчымасць гуляць на «дарослым» узроўні, дае ўсе шанцы праявіць сябе.

«Энергетык-БДУ» – самая «маладая» каманда Вышэйшай лігі Беларусі па футболе і адна з самых юных каманд, якія выступаюць у вышэйшых лігах еўрапейскіх чэмпіянатаў. Сярэдні ўзрост гульцоў «Энергетыка-БДУ» каля 21 года. І гэта невыпадкова, бо яго мэта якраз і заключаецца ў развіцці маладых гульцоў.

Футбольны клуб трэніруецца на сваім хатнім стадыёне Рэспубліканскага цэнтра алімпійскага рэзерву па футболе БДУ. Ён знаходзіцца ў Мінску на вуліцы Сямашкі, 13. Стадыён быў пабудаваны ў 1995-м годзе. Уздоўж арэны размешчана трыбуна на 1500 гледачоў, якая абсталявана навесам. У 2019-м годзе на стадыёне было заслана штучнае поле апошняга пакалення. Наладжана штучнае асвятленне, прэс-ложа забяспечана бесправадным інтэрнэтам і разеткамі.

– У некаторых футбольных клубаў, прама скажам, шыкоўныя базы. У «Энергетыка-БДУ» яна больш сціплая. Але гэта такое месца, дзе людзі працуюць на сваю мару, аддаюць усяго сябе ўлюбёнай справе. Галоўнае – разумець, чаго ты хочаш дамагчыся, і ісці да сваёй мэты, – гаворыць Павел.

Каб патрапіць у «Энергетык-БДУ», трэба прайсці прагляд. А каб патрапіць у дубль ці ў першую каманду – быць прафесійным футбалістам.

У нацыянальных чэмпіянатах Беларусі каманда выступае з 1996 года. Да 2016 года насіла назву «Зорка-БДУ».

Нечакана для многіх у гэтым сезоне галоўная каманда «Энергетыка-БДУ» стабільна знаходзілася наверсе турнірнай табліцы Вышэйшай лігі Беларусі па футболе. У адзін момант «студэнты» адставалі ад «Шахцёра» з першага радка ўсяго толькі на адзін бал. І многія фанаты футбола сур'ёзна задумаліся пра чэмпіёнства падапечных Паўла Раднёнка (прызначаны на пасаду галоўнага трэнера клуба 1 лютага 2022 года. – Заўв. рэд.). Але каляндар у «Энергетыка» быў нялёгкі: два матчы з мінскім «Дынама», сустрэча з БАТЭ і гасцявы выезд у Гомель. Па словах Паўла, каманда не глядзіць на тытулы супернікаў, а канцэнтруецца на сваёй гульні.

– Як дубль, так і першая каманда ставяць перад сабой высокія мэты. Не шмат хто ведае, якую працу выконваюць каманды, асабліва на зборах. Думаю, ніводная каманда так не працуе на працягу сезона, як «Энергетык-БДУ». У свеце футбола ведаюць, што мы раней за ўсіх выходзім з зімовага адпачынку і пачынаем трэніравацца, пакуль іншыя адпачываюць. Кожны дзень пачынаецца на трэніравальнай базе. Часам, бывае, ты сонны, а трэніроўкі пачынаюцца з самай раніцы, але ўсё адно ідзеш і робіш усё дзеля сваёй мары. Як мы бачым, гэта акупляецца, мяркуючы па бягучай турнірнай табліцы. Каляндар быў цяжкім – моцныя каманды. Але калі ты настройваешся не на суперніка, а на сам матч, то нашмат лягчэй гуляецца. У такія моманты забываеш, супраць каго ты выходзіш на поле. У цябе мэта – перамагчы, выйграць кожнае адзінаборства і кожны мяч, аддаць галявую перадачу ці забіць гол. Я лічу, у «Энергетыка» аж да апошняга тура захоўваліся добрыя шанцы ўзяць чэмпіёнства. Таму што і дублюючы склад, і галоўная каманда заматываны вельмі моцна, – каментуе Павел.

У «Энергетыку» студэнт адыграў паўтара года. Тым не менш ужо ёсць перамога, якая назаўжды застанецца ў яго памяці:

– За той час, што я ў «Энергетыку», асабіста для мяне самай важнай была гульня з мінскім «Дынама»: мы выйгралі адзін – нуль. Матч быў вельмі напружаным, а мы забілі на апошніх хвілінах. Усё-такі на той момант «Дынама-Мінск» лічылі фаварытамі ў Вышэйшай лізе. У яго складзе выступалі знакамітыя гульцы, напрыклад, паўабаронца Аляксей Рыас. Памятаю, мы выходзілі на гэту гульню вельмі зараджанымі. Уся наша самааддача акупілася – мы забілі ў самым фінале.

Ілья ВАРАБ'ЁЎ

Па выніках Вышэйшай лігі Беларусі «Энергетык-БДУ» заняў другое месца ў турнірнай табліцы. Клуб адстаў ад салігорскага «Шахцёра» на пяць балаў і на адзін бал абышоў БАТЭ і «Дынама-Мінск». Упершыню ў гісторыі клуба футбалістам атрымалася дайсці да медалёў. Другое месца ў табліцы азначае, што ў наступным сезоне «Энергетык» згуляе ў еўракубках – у кваліфікацыі да Лігі канферэнцый УЕФА. Дублюючая каманда «Энергетыка» ўвогуле ўпершыню ў гісторыі стала трыўмфатарам рэзервовай Вышэйшай лігі Беларусі: «студэнты» апярэдзілі найбліжэйшага пераследніка ў асобе мінскага «Дынама» на два ачкі.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 22.11.2022 г.
Зак. 1048. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Рэдактар Дар'я Аляксандраўна ПАЎЛЮЧУК
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by